Российская революция 1917 года в истории и судьбах народов и регионов России, Беларуси, Европы и мира в контексте исторических реалий XX—XXI века: материалы международной научной конференции. Витебск — Псков, 27 февраля — 3 марта 2017 г. / Вит. гос. ун-т; редкол.: А. В. Егоров (гл. ред.) [и др.]. — Витебск, 2017. — С. 184—190.

**Бурачонак Аляксандр Вячаслававіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

## ЗМЕНЫ Ў ЭКАНАМІЧНЫМ ЖЫЦЦІ БЕЛАРУСІ НАПЯРЭДАДНІ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ УЗРУШЭННЯЎ 1917 Г.

У канцы 1916 г. — пачатку 1917 г. у эканамічным жыцці на неакупіраванай частцы тэрыторыі Беларусі назіраліся катастрафічныя з'явы, якія падштурхнулі большасць мясцовага насельніцтва да ўдзелу ў рэвалюцыйных узрушэннях 1917 г. на антыўрадавых пазіцыях. Падзеі Першай сусветнай вайны ўнеслі значныя карэктывы ў развіццё гаспадаркі беларускіх губерняў, якая ў парэформенныя дзесяцігоддзі, у адрозненне ад разглядаемага часу, выяўляла тэндэнцыі да росту.

Пачынаючы з другой паловы XIX ст. адбывалася павелічэнне прамысловага патэнцыялу беларускіх губерняў Расійскай імперыі. На змену папулярнай у першай палове XIX ст. мануфактурнай форме вытворчасці прыходзілі прадпрыемствы, аснашчаныя механічным рухавіком. За апошнія два дзесяцігоддзі XIX ст. на тэрыторыі Беларусі было ўведзена ў строй у чатыры разы больш фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў, чым за папярэднія 20 гадоў. Агульная ж колькасць фабрык і заводаў за чатыры парэформенныя дзесяцігоддзі павялічылася з 76 да 1137, а аб'ём вытворчасці ў грашовым выражэнні — з 1,9 да 72,1 млн руб. [2, с. 86—87]. У пачатку XX ст. тэмпы росту колькасці фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў і сумарнага кошту выробленай на іх прадукцыі некалькі замарудзіліся, бо у гэты час негатыўнае значэнне для развіцця прамысловага прадпрымальніцтва беларускіх губерняў меў эканамічны крызіс 1899—1903 гг. Яго наступствы былі адчувальнымі для прамысловасці беларускіх губерняў амаль на працягу ўсяго першага дзесяцігоддзя XX ст. Ажыўленне ў гэтай сферы адбылося толькі ў 1908 г., а з 1910 г. пачаў назірацца інтэнсіўны ўздым у вытворчасці. За 1910—1913 гг. прырост прадукцыі склаў 27,2 млн руб., што ў 1,9 разы было вышэй за прырост прадукцыі за 1901—1908 гг. [10, с. 36—39].

У канцы XIX — пачатку XX ст. пэўныя змены назіраліся і ў гандлёвым развіцці Беларусі. Трансфармацыя форм ажыццяўлення гандлёвага прадпрымальніцтва ў беларускіх губернях прынесла свае вынікі. Аптовы абарот гандлю на тэрыторыі Беларусі за перыяд 1885—1913 гг. вырас з 9,35 да 79,1 млн руб., або прыкладна ў 8,5 разоў. Аб'ёмы рознічнага тавараабароту павялічыліся за гэты ж перыяд у 6,2 разы — з 26,28 руб. да 162,8 млн руб. Пры гэтым тэмпы росту рознічнага гандлю ў беларускіх губернях у 1908—1913 гг. былі вышэйшымі, чым у цэлым па Расійскай імперыі. Сярэднегадавы тэмп прыросту рознічнага таваразвароту Беларусі ў 1908—1912 гг. склаў 5,2 %, а ў Расійскай імперыі ў цэлым — 4,5 %. Найбольшы ж прырост па Беларусі і па Расіі даў 1913 г., склаўшы 14,4 % і 8,4 % адпаведна [10, с. 240—241, 246, 250; 7, с. 103—104].

Варта адзначыць, што ў канцы XIX — пачатку XX ст. у гаспадарцы Беларусі назіраліся не толькі рост аб’ёмаў тавараzвароту і нарошчванне магутнасці прамысловай вытворчасці. Змянялася сама арганізацыя прадпрымальніцкай дзейнасці. Прадпрымальнікі ў беларускіх губернях ажыццяўлялі сваю дзейнасць не толькі ў выглядзе аднаасобнага прадпрыемства, але і ў разнастайных формах асацыіравання капіталу — поўных таварыстваў і таварыстваў на веры, а таксама акцыянерна-паявых кампаній. За 1892—1914 гг. колькасць гандлёвых дамоў у пяці беларускіх губернях павялічылася з 27 да 443, акцыянерна-паявых таварыстваў — з 8 да 37 [3, с. 58]. У дадатак да гэтага, у пачатку XX ст. на тэрыторыі Беларусі атрымалі распаўсюджанне і манапалістычныя аб’яднанні — запалкавы сіндыкат у Мінску, сіндыкат піваварных заводчыкаў у Оршы, сіндыкат уладальнікаў канвертных заводаў «Прадакон» і інш. [10, с. 23].

Разам з развіццём гандлёва-прамысловай сферы на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. адбывалася станаўленне крэдытна-банкаўскай сістэмы, якая давала магчымасць атрымаць пазыку як буйным, так і дробным прадпрымальнікам. Больш уплывовыя прадстаўнікі дзелавога свету беларускіх губерняў маглі атрымаць пазыку ў мясцовых аддзяленнях Дзяржаўнага банку Расійскай імперыі, аддзяленнях расійскіх акцыянерных банкаў і гарадскіх грамадскіх банкаў. Прадпрымальнікі больш ніжэйшага рангу крэдытаваліся ў банкірскіх дамах і канторах, таварыствах узаемнага крэдыту, пазыковай казне і іншых установах дробнага крэдыту. На працягу разглядаемага перыяду назіраўся рост колькасці крэдытных устаноў, якія функцыянавалі на тэрыторыі Беларусі. Так, толькі за 1901—1913 гг. колькасць прыватных камерцыйных банкаў павялічылася з 4 да 20, таварыстваў узаемнага крэдыту — з 5 да 74, гарадскіх грамадскіх банкаў — з 2 да 9 [5, с. 30].

Пройдзены ў другой палове XIX — пачатку XX ст. гаспадаркай Беларусі шлях мадэрнізацыі дазволіў пэўным прадстаўнікам мясцовай дзелавой эліты ў перадваенныя гады дасягнуць такога ўзроўню, што яны змаглі канкурыраваць з выхадцамі з цэнтральных і ўсходніх губерняў Расійскай імперыі. Аднак Першая сусветная вайна, як ужо адзначалася, карэнным чынам змяніла сітуацыю, якая склалася ў эканамічнай сферы ў парэформенныя дзесяцігоддзі.

З самых першых дзён вайны на большасці прамысловых прадпрыемстваў па прычыне цяжкасцей у збыце прадукцыі і ў атрыманні новага абсталявання, а таксама з-за недахопу сыравіны быў зменшаны аб’ём вытворчасці. Шмат у чым гэта было выклікана і тым, што з аб’яўленнем усеагульнай мабілізацыі многія чыгуначныя станцыі спынілі прыём і адпраўленне прыватных грузаў. Акрамя таго ўладары прадпрыемстваў страцілі частку кваліфікаваных працоўных, якія былі мабілізаваны ў армію. У выніку, каля 20 % усіх дзеючых на тэрыторыі Беларусі прамысловых устаноў спынілі працу толькі ў першыя месяцы вайны. Разам з тым, пэўныя прамыслоўцы на тэрыторыі Беларусі здолелі амаль цалкам перапрафіляваць свае прадпрыемствы для вырабу прадукцыі, неабходнай фронту. У канцы 1914 г. заказы ваеннага ведамства ў беларускіх губернях выконвалі 217 прамысловых устаноў. Выпускам абароннай прадукцыі былі заняты дзве трэці рабочых цэнзавай прамысловасці [4, с. 174—175]. Тым не менш, гэта былі толькі

часовыя меры. Ажыўленне прамысловасці ў беларускіх губернях, якое назіралася ў пачатку 1915 г., ужо вясной было паралізавана наступленнем немцаў. Летам 1915 г. пачалася эвакуацыя прамысловых прадпрыемстваў і каштоўнага абсталявання з заходніх раёнаў Беларусі ўглыб Расійскай Імперыі, асноўная хваля якой праходзіла стыхійна і бессістэмна, з вялікімі стратамі абсталявання і гатовай прадукцыі. Усяго за гады вайны з тэрыторыі Беларусі былі вывезены або дэманціраваны 432 прадпрыемствы, частка з якіх так і не была рээвакуіравана [1, с. 141], што безумоўна негатыўна паўплывала на вытворчы патэнцыял беларускіх губерняў.

Пасля ўсталявання ў кастрычніку 1915 г. фронту па лініі Дзвінск–Паставы–Баранавічы–Пінск, прамысловыя прадпрыемствы, якія не паспелі эвакуіраваць з заходняй часткі тэрыторыі Беларусі, апынуліся пад кантролем акупантаў. На неакупіраванай тэрыторыі Беларусі выраб прамысловай прадукцыі працягваўся. Пры гэтым не толькі буйныя фабрыкі і заводы былі пераведзены на ваенныя рэйкі — да выпуску вайсковай прадукцыі былі таксама прыцягнуты рамесныя майстэрні і невялікія прадпрыемствы. Аднак, нягледзячы на наяўнасць заказаў з боку ваеннага ведамства, у канцы 1915 г. на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі функцыянавала толькі 139 прамысловых прадпрыемстваў, на якіх працавала каля 38 % ад даваеннай колькасці працоўных [8, с. 45].

Становішча ў прамысловай вытворчасці пэўным чынам палепшылася толькі вясной 1916 г. На гэты момант у Віцебскай губерні налічвалася 61 прамысловае прадпрыемства, у Мінскай — 134, у Магілёўскай — 99. Пры гэтым, прамысловая вытворчасць мірнай прадукцыі ў Беларусі складала мізэрную долю ў параўнанні з тым, што выраблялася да вайны. Гэта прывяло да таго, што назіраўся дэфіцыт тавараў першай неабходнасці і адначасова рост спекуляцыі. У сваю чаргу, гэта выклікала павелічэнне цэн на ўсе тавары разам са зніжэннем заробку на 60—80 % ад даваеннага ўзроўню. Да працы ў прыфрантавой паласе прыцягвалася ўсё працаздольнае насельніцтва, за выключэннем выкладчыкаў, навучэнцаў, дзяржслужачых і духавенства [9, с. 84—85, 92]. Да 1917 г. аб'ём вытворчасці прамысловых прадпрыемстваў, якія не выконвалі замовы вайсковага ведамства, складалі прыкладна 15—16 % ад даваеннага ўзроўню [8, с. 46]. Зразумела, што гэта прыводзіла да пашырэння дэфіцыту тавараў першай неабходнасці.

Змены, якія адбыліся ў эканамічным жыцці беларускіх рэгіёнаў, закранулі не толькі прамысловых прадпрымальнікаў, але і гандляроў. Перш за ўсё значна скараціўся аб'ём гандлёвых аперацый лесам, што было звязана з закрыццём заходніх рынкаў і змяншэннем попыту на яго ў паўднёвых губернях Расійскай Імперыі. Разам з тым адбылося скарачэнне аб'ёмаў экспартнага гандлю льном. Апошняе не мела ў параўнанні з лясным гандлем такіх катастрафічных маштабаў, паколькі існаваў вялікі попыт на льняную сыравіну з боку Маскоўскага прамысловага раёну. Тым не менш гандлёвыя абароты льну толькі ў Віцебскай губерні скараціліся ў 2,5 разы [6, с. 34—35].

Змены адбыліся і ва ўнутраным гандлі. Змяншэнне попыту мясцовага насельніцтва кампенсавалася павелічэннем спажывецкага попыту вялікай колькасці бежанцаў і вайскоўцаў. Больш актыўна сталі гандляваць мясам, тытунём, збожжам і жалезам, паколькі попыт на дадзеную прадукцыю

значна ўзрос. У цэлым жа ёмістасць унутранага рынку Беларусі на мяжы 1914—1915 гг. павялічылася [10, с. 267—268]. Праўда, ужо ў сярэдзіне 1915 г. мясцовыя гандляры сутыкнуліся з іншай праблемай — недахопам тавараў, якія не траплялі на тэрыторыю Беларусі з унутраных губерняў Расійскай імперыі па прычыне існаваўшых абмежаванняў на чыгунцы. Па прычыне нарастання крызісных з'яў у сельскай гаспадарцы і прамысловай вытворчасці Беларусі, а таксама з-за перанапружанасці чыгуначнага транспарту ваеннымі перавозкамі з кожным месяцам сітуацыя з забеспячэннем мясцовага насельніцтва прадуктамі харчавання і таварамі першай неабходнасці станавілася ўсё больш катастрафічнай. Усё вышэйадзначанае выклікала незадаволенасць вайной і ўрадам, у першую чаргу, сярод простага насельніцтва Беларусі. Яны сустракалі рэвалюцыйныя ўзрушэнні у лютым 1917 г. з надзеяй на паляпшэнне свайго становішча. Аднак, ні Лютаўская рэвалюцыя, ні першыя пераўтварэнні бальшавіцкага ўраду пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі сітуацыю ў эканамічнай сферы змяніць у лепшы бок не здолелі.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Бабков, А. Эвакуация промышленности Беларуси в годы Первой мировой войны / А. Бобков / Гісторыя, культуралогія, мастацтвазнаўства: Матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый» / Рэдкал.: В. Скалабан (гал. рэд.) і інш. — Мінск: «Беларускі кнігазбор», 2001. — С. 135—141.
2. Болбас, М. Ф. Промышленность Белоруссии: 1860—1900 / М. Ф. Болбас. — Мінск: Изд-во БГУ им. В. И. Ленина, 1978. — 311 с.
3. Бурачонак, А. В. Распаўсюджванне асацыіраванага капіталу на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст. / А. В. Бурачонак // Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя. — 2017. — № 2. — С. 54—61.
4. Бурачонак, А. В. Становішча прадпрымальнікаў на тэрыторыі Беларусі ў пачатковы перыяд Першай сусветнай вайны / А. В. Бурачонак // Первая мировая война в исторических судьбах Европы: сб. материалов Междунар. науч. конф., г. Вилейка, 18 окт. 2014 г. / редкол.: В. А. Богуш (пред.) [и др.]. — Минск: Изд. центр БГУ, 2014. — С. 173—177.
5. Драздова, К. А. Станаўленне капіталістычных банкаў на тэрыторыі беларускіх губерняў у другой палове XIX — пачатку XX ст. / К. А. Драздова, Л. Л. Шкуцько // Весці Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта. Серыя 2. — 2006. — № 4. — С. 27—31.
6. Михневич, Л. М. Торговля Белоруссии (1900—1970 гг.) / Л. М. Михневич. — Минск: Наука и техника, 1973. — 222 с.
7. Полетаева, Н. И. Купечество Беларуси: 60-е гг. XIX — начало XX вв. / Н. И. Полетаева. — Минск: Наука и техника, 2004. — 247 с.
8. Сасим, А. М. Промышленность Беларуси в XX столетии / А. М. Сасим. — Минск: Экоперспектива, 2001. — 271 с.
9. Хаданёнак, В. М. Сацыяльна-эканамічнае становішча насельніцтва на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны (кастрычнік 1915 — кастрычнік 1917 гг.): манаграфія / В. М. Хаданёнак. — Віцебск: УА «ВДТУ», 2015. — 161 с.
10. Экономика Белоруссии в эпоху империализма (1900—1917) / под ред. Г. Т. Ковалевского [и др.]. — Минск: Изд-во АН БССР, 1963. — 420 с.